# ВЕРШЫ-ПРЫСВЯЧЭННІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

І. С. Мяцеліца
Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы (Мінск)
Навук. кіраўн. – Я. А. Гараднiцкi, канд. філалаг. навук, ст. навук. супрацоўнік

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца вершы-прысвячэнні як адметная з’ява сучаснай беларускай паэзіі, выяўляюцца іх спецыфічныя рысы, вызначаюцца ідэнтыфікацыйныя элементы.

**Ключавыя словы:** паэзія; прысвячэнне; адрасат; пафас; ідэнтыфікацыя.

Вершы-прысвячэнні, да якіх часта звяртаюцца сучасныя паэты, у розныя гістарычныя перыяды адлюстроўвалі выразныя прыкметы свайго часу, якімі і вызначаліся асноўныя аўтарскія задачы. Яскравыя ўзоры прысвячэнняў сустракаюцца яшчэ ў старажытнай літаратуры. Гэта жанравая форма старабеларускага публіцыстычнага пісьменства часта насіла панегірычны характар і выконвала функцыі, значна адрозныя ад тых, якія сучасныя паэты ўскладаюць на творы такога кшталту: у большасці свае адрасныя тэксты пісаліся для мецэнатаў, здольных аказаць матэрыяльную падтрымку ў кнігавыдавецкай справе; для славутых асоб, што служыла абаронай кнігі ад крытыкі і знішчэння; многія прысвячэнні выконвалі дыдактычную функцыю [2]. Традыцыя пазначэння канкрэтнага адрасата літаратурнага твора атрымала працяг і ў наступныя стагоддзі, захаваўшыся да нашых дзён, але значна змяніўшы і функцыі, і форму. У сучасным разуменні шматлікія прыклады прысвячэння (аўтарскага надпісу, што ўказвае на асобу ці падзею, у гонар якіх напісаны твор) знаходзім ў творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і многіх іншых пісьменнікаў, якія часта пазначалі, каму адрасаваны верш, непасрэдна ў назве (ці пад назвай). Як правіла, адрасатамі былі вядомыя гістарычныя дзеячы, прадстаўнікі культуры і мастацтва (Мікалай ІІ, С. Булат, М. Канапніцкая, Т. Шаўчэнка, С. Палуян, Ш. Руставелі і інш.). У савецкія часы літаратурная форма верша-прысвячэння не згубіла актуальнасці, але часта мела адценне штучнасці і фармальнасці: вершы названага тыпу пісаліся да святкавання знакавых дат і падзей, угодкаў, юбілеяў пісьменнікаў і выбітных асоб мінулага і нашых дзён. У гэтым кантэксце часта з’яўленне падобных твораў было вынікам не шчырага аўтарскага памкнення, а адкрытай сацыяльнай замовы, што адбівалася на змесце і эмацыйным гучанні твора. Самастойнасць сучасных аўтараў у выбары адрасата паспрыяла з’яўленню шматлікіх вершаў-прысвячэнняў, часам, заўважна адрозных ад аналагічных твораў літаратурных папярэднікаў. Як і раней, у XXI ст. ці не самыя вялікую групу складаюць прысвячэнні калегам па пяру – пісьменнікам. На іх і спынімся больш падрабязна.

Адметнасцю значнай колькасці сучасных вершаў, прысвечаных пісьменнікам, з’яўляецца высокая ступень набліжанасці аўтара да адрасата. Прафесійныя кантакты, агульнае кола знаёмых спрыялі і спрыяюць усталяванню паміж літаратарамі прыяцельскіх і сяброўскіх адносін. Гэта ў сваю чаргу накладае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

заўважны адбітак на напаўненне вершаванага прысвячэння. Так, у кнізе вершаў В. Жуковіча “Не завіце радзіму малой” [3] змешчаны цыкл вершаў “У беларускім пантэоне”, які складаецца з паэтычных прысвячэнняў беларускім паэтам. Побач з вядомымі шырокаму колу чытачоў імёнамі Я. Янішчыц, Н. Мацяш, А. Сыса, А. Пісьмянкова – менш гучныя, але не менш важныя для аўтара людзі: М. Рудкоўскі, Т. Чабан, В. Сахарчук, В. Гадулька. У адным паэтычным цыкле іх яднае не столькі прафесійная прыналежнасць і прызнанасць, колькі асабістая значнасць для аўтара. Агульная часавая прастора, а таксама факт асабістага знаёмства з паэтамі, іх сем’ямі накладае адбітак на змест і эмацыйны фон твораў, набліжаючы іх да вершаў-прысвячэнняў блізкім людзям, членам сям’і (“*Яшчэ не раз я узгадаю / Дзень пахавання Пісьмянкова: / Алег Антонавіч рыдае, / Плач не дае прамовіць слова”* [3, с. 90]; “*Да цябе зноў звяртаюся, Ніна…*” [3, с. 89]). Вершы цыкла прасякнуты не высокім пафасам грамадзянскага гучання, а непадробнымі эмоцыямі, насычаны шматлікімі ўспамінамі, фактамі з жыцця пісьменнікаў. Іншае – кантраснае – гучанне маюць творы з цыкла акравершаў, дзе зашыфраваны прозвішчы М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі і іншых пісьменнікаў, у дачыненні да якіх чытаем азначэнні “непадкупны волат”, “Апостал праўды”, “рыцар роднай мовы”, “ахвярны пясняр”, “санцадайны творца”, “светлы геній”, “музай цалаваны стваральнік” і г.д. [3]. Статус названых асоб, адсутнасць асабістых кантактаў з імі і часавая аддаленасць правакуюць аўтара прысвячэнняў на спалучэнне афіцыёзнасці і пачуцця, часам, залішні пафас і патэтыку.

Прыклады вершаў-прысвячэнняў сустракаем і ў творчасці Л. Галубовіча. Так, яго верш “Мы на “фордзе” са Светай ляцім…”, прысвечаны С. Купрэевай, – светлы і адначасова балючы ўспамін пра яе бацьку, беларускага пісьменніка М. Купрэева. У некалькіх строфах – цэлы россып фактаў з жыцця Міколы Сымонавіча: і палескія *“шляхі валацужнага паэта”*, якія ён схадзіў пешшу, і гісторыя трагічнай смерці маці, і імёны блізкіх (*“<…>, а верыў ён Маме, // што забіта была маладой. / двойчы ў чорнай зямлі пахавана… / “Божа мой, Божа мой, Божа мой…” – / шэпча першая жонка Таццяна”*) [1, с. 89–90]. Такія адметнасці вершаванага прысвячэння знаёмаму чалавеку, як апісанне малавядомых фактаў біяграфіі, перадача рэальных дыялогаў, дэталізацыя вобразаў і падзей выразныя і ў вершах “Развітальнае” (памяці паэта У. Марука), “Рускі чалавек Барыс Бур’ян” (памяці крытыка Б. Бур’яна), “Даўно ні мамы, ні Сыса…” (памяці паэта А. Сыса) і інш. Інтымнасць, шчырасць гучання вершаў-прысвячэнняў такога кшталту несумненна набліжае да чытача і аўтара, і асабліва адрасатаў: з недасяжных класікаў яны пераўтвараюцца ў звычайных людзей і карэктуюць такім чынам традыцыйнае чытацкае ўспрыняцце сваёй асобы і творчасці. Зрэшты, побач са старэйшымі калегамі, якія адрасуюць вершы-прысвячэнні знаёмым пісьменнікам, аўтары іншых пакаленняў таксама пішуць вершаваныя пасланні паэтам-знаёмым (А. Адамовіч – Т. Нядбай, І. Бабкоў – А. Хадановічу, А. Емяльянаў-Шыловіч –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

С. Верацілу, А. Спрынчан і г.д.), такім чынам ствараючы своеасаблівы паэтычны дзённік беларускага літаратурнага працэсу пачатку XXI стагоддзя.

Дастаткова вялікая колькасць сучасных вершаў-прысвячэннаў мае значна меншую ступень інтымнасці. У многіх паэтычных творах, прысвечаных пэўным пісьменнікам, аўтары выяўляюць высокі піетэт і павагу, завастраючы ўвагу не на асабістых кантактах з адрасатам, яго чалавечых якасцях і ўчынках, а на значнасці асобы як творцы, настаўніка, пісьменніка нацыянальнага маштабу. У такіх вершах-прысвячэннях важным дадатковым ідэнтыфікацыйным элементам, акрамя аўтарскага надпісу, выступаюць словы і імёны-маркеры, якія выразна ўказваюць на канкрэтнага пісьменніка; пазнавальныя цытаты з яго твораў і пад. Так, радкі “*горад абвешаны / яйкаквадратамі*” [4, с. 25] ці “*Твае ЗНОМы – / сэнсу зломы*” [1, с. 67] беспамылкова выдаюць у адрасаце Алеся Разанава; “*Там Зоська і Зміцер, чырвоныя з белымі, / І “Хатка” ягоная асірацелая…*” [7, с. 34], “*Бы той гаршчок ў Егіпецкай зямлі*” [6, с. 210] – М. Багдановіча, “*Убачу спамлёную сонцам і часам Паўлінку*” [5, с. 9], “*А хто там ідзе? А хто там ідзе, / Песні спявае, дудзіць на дудзе*” [5, с. 4] – Я. Купалу. Выкарыстанне такіх дапаможных элементаў з’яўляецца трывалым сувязным звяном паміж аўтарскім тэкстам і асобай, якой адрасаваны верш. Разам з тым цэлы корпус вершаваных прысвячэнняў для чытача носіць умоўна адрасны характар, так як, акрамя аўтарскага надпісу, не змяшчае відавочных кампанентаў, якія ўказваюць на канкрэтнага пісьменніка. Так, у вершах А. Івашчанкі, прысвечаных В. Жыбулю, Б. Пятровічу, У. Сцебураку, С. Прылуцкаму і інш., непадрыхтаванаму чытачу складана знайсці сувязь паміж аўтарам і адрасатам і выявіць прычыну прысвячэння: “*крылатыя вершнікі / кудлатыя вершыкі / пярнатыя коньнікі / стракочуць бы конікі / з-пад стосаў паперы / у белай траве ры- / фмары-інтраверты // падрыгвае пер’е / з-пад пальцаў нясьмелых / выскокваюць пеўлы / пярнатых пісьменыкаў / крылатых пісьметнікаў / рыпяць іх прапелеры / у стосах траверы / кудлатыя зьверы / very ы-ы-ы-ы*” (“*Крылатыя вершнікі. Наталлі Русецкай*”) [4, с. 31] Такія ўзоры вершаў-прысвячэнняў маюць нізкую ступень распазнавання і вымагаюць глыбокага ведання творчасці абодвух пісьменнікаў ці дадатковых спецыфічных ведаў.

Такім чынам, вобраз паэта XXI стагоддзя, свабоднага і самастойнага ў вызначэнні аўтарскай стратэгіі, выразна выявіў сябе ў вершах-прысвячэннях, якія ў значнай колькасці ўзбагацілі сучасную беларускую літаратуру. Сярод іх вылучаецца група паэтычных прысвячэнняў пісьменнікам, якая мае свае адметныя рысы: высокі піетэт у дачыненні да класікаў беларускай літаратуры, аўтарскія акцэнты на значнасці асобы творцы, ідэнтыфікацыйныя элементы ў выглядзе цытат, слоў і імёнаў-маркераў і пад.; дэмакратытызацыя вобразаў літаратурных мэтраў – сучаснікаў аўтараў прысвячэнняў, шчырасць, біяграфічная дэталізацыя, высокая ступень набліжанасці да адрасата і пад.

*Літаратура*

1. Галубовіч, Л. З гэтага свету / Л. Галубовіч – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 106 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Грыневіч, Т. Функцыі прысвячэння ў прадмоўна-пасляслоўным комплексе кірылічных выданняў к. XVI – пач. XVII стст. / Т. Грыневіч // Электронная бібліятэка БДУ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/55562/1/%D0%93%D1%80%D1%8B%D0%BD%D0%B5%D0%B2%D1%96%D1%87%20%D0%A2.%D0%86.%20%D0%A4%D1%83%D0%BD%D0%BA%D1%86%D1%8B%D1%96%20%D0%BF%D1%80%D1%8B%D1%81%D0%B2%D1%8F%D1%87%D1%8D%D0%BD%D0%BD%D1%8F%20%D1%9E%20%D0%BF%D1%80%D0%B0%D0%B4%D0%BC%D0%BE%D1%9E%D0%BD%D0%B0-%D0%BF%D0%B0%D1%81%D0%BB%D1%8F%D1%81%D0%BB%D0%BE%D1%9E%D0%BD%D1%8B%D0%BC%20%D0%BA%D0%BE%D0%BC%D0%BF%D0%BB%D0%B5%D0%BA%D1%81%D0%B5%20%D0%BA%D1%96%D1%80%D1%8B%D0%BB%D1%96%D1%87%D0%BD%D1%8B%D1%85%20%D0%B2%D1%8B%D0%B4%D0%B0%D0%BD%D0%BD%D1%8F%D1%9E%20%D0%9A.%D0%A5V%D0%86%20-%20%D0%BF%D0%B0%D1%87.%20%D0%A5V%D0%86%D0%86%20%D1%81%D1%82%D1%81%D1%82..pdf – Дата доступу: 13.05.2017.
3. Жуковіч, В. Не завіце радзіму малой / В. Жуковіч – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 245 с.
4. Івашчанка А. Хай так / А. Івашчанка – Мінск : Галіяфы, 2013. – 120 с.
5. Новыя вершы беларускіх паэтаў. У вянок Янку Купалу // Полымя. – 2012. – № 7. – С. 3 – 9.
6. Рублеўская, Л. І. Шыпшына для пані : вершы і эсэ / Л. І. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 254 с.
7. Сівец, Т. Таму, хто знойдзе… (Каханне ды іншыя казкі) : вершы, проза, п’есы, пераклады / Т. Сівец. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2008. – 184 с.
8. Шматкова, І. Вершы прысвячэнні ў лірыцы беларускіх паэтэс другой паловы XX стагоддзя / І. Шматкова // Электронная бібліятэка БДУ [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/29751/1/%D0%86%D1%80%D1%8B%D0%BD%D0%B0%20%D0%A8%D0%BC%D0%B0%D1%82%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D0%B0%20%D0%92%D0%B5%D1%80%D1%88%D1%8B-%D0%BF%D1%80%D1%8B%D1%81%D0%B2%D1%8F%D1%87%D1%8D%D0%BD%D0%BD%D1%96%20%D1%9E%20%D0%BB%D1%96%D1%80%D1%8B%D1%86%D1%8B%20%D0%B1%D0%B5%D0%BB%D0%B0%D1%80%D1%83%D1%81%D0%BA%D1%96%D1%85%20%D0%BF%D0%B0%D1%8D%D1%82%D1%8D%D1%81%20%D0%B4%D1%80%D1%83%D0%B3%D0%BE%D0%B9%20%D0%BF%D0%B0%D0%BB%D0%BE%D0%B2%D1%8B%20%D0%A5%D0%A5%20%D1%81%D1%82%D0%B0%D0%B3%D0%BE%D0%B4%D0%B4%D0%B7%D1%8F.pdf – Дата доступу: 13.05.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ